# Апісанне палітыкі па выключэнні канфлікту інтарэсаў і ўмоў яго ўзнікнення ў ЗАТ «ГК Банк» і банкаўскім холдынгу, галаўной арганізацыяй якога з'яўляецца ЗАТ «ГК Банк»

Палажэнне аб парадку кіравання канфліктам інтарэсаў у ЗАТ «ГК Банк» і банкаўскім холдынгу, галаўной арганізацыяй якога з'яўляецца ЗАТ «ГК Банк» (далей – Палажэнне), вызначае палітыку кіравання канфліктам інтарэсаў у ЗАТ «ГК Банк» і банкаўскім холдынгу, галаўной арганізацыяй якога з'яўляецца ЗАТ «ГК Банк» (далей - Холдынг).

У адпаведнасці з патрабаваннямі Палажэння ЗАТ «ГК Банк» (далей – Банк) выяўляе канфлікт інтарэсаў, прымае меры па ўрэгуляванні і выключэнні канфлікту інтарэсаў і ўмоў яго ўзнікнення ў дзейнасці Банка і Холдынгу, а таксама ажыццяўляе кантроль паўнаты і эфектыўнасці прымаемых у Банку мер па ўрэгуляванні канфлікту інтарэсаў.

Пад канфліктам інтарэсаў разумеецца супярэчнасць паміж маёмаснымі і іншымі інтарэсамі Банка і яго акцыянераў (бенефіцыярных уладальнікаў і іншых уладальнікаў), органаў кіравання Банка і іх членаў, арганізацый, якія ўваходзяць у склад Холдынгу, падраздзяленняў Банка, яго работнікаў, кліентаў (контрагентаў), якое можа пацягнуць за сабой негатыўныя наступствы для Банка і (або) яго кліентаў (кантрагентаў).

У Палажэнні вызначаны сферы і ўмовы ўзнікнення канфлікту інтарэсаў, парадак выяўлення і ўрэгулявання канфлікту інтарэсаў, а таксама асноўныя ўдзельнікі кіравання канфліктам інтарэсаў (органы кіравання, службовыя асобы, работнікі Банка і інш.), іх паўнамоцтвы і адказнасць.

Да сфер узнікнення канфлікту інтарэсаў адносяцца супярэчнасці паміж:

стратэгічнымі інтарэсамі Банка (атрыманне прыбытку, забеспячэнне фінансавай надзейнасці, здольнасць Банка да доўгачасовага існавання ў якасці прыбытковай фінансавай арганізацыі, арганізацыя эфектыўнага карпаратыўнага кіравання Банкам, падтрыманне дзелавой рэпутацыі, вырашэнне сацыяльна-эканамічных задач і іншыя інтарэсы);

інтарэсамі органаў кіравання Банка і Банка як арганізацыі;

інтарэсамі Савета Дырэктараў Банка і Праўлення Банка;

маёмаснымі, іншымі інтарэсамі Банка і яго кліентаў (контрагентаў), акцыянераў (бенефіцыярных уладальнікаў і іншых уладальнікаў);

інтарэсамі Банка і арганізацый, якія ўваходзяць у склад Холдынгу;

інтарэсамі падраздзяленняў (службовых асоб) Банка, якія генеруюць рызыкі, і падраздзяленняў (службовых асоб) Банка, якія ажыццяўляюць кіраванне гэтымі рызыкамі або ўнутраны кантроль, у тым ліку комплаенс-кантроль;

службовымі абавязкамі работніка (функцыямі падраздзялення) Банка;

іншыя супярэчнасці, указаныя ў Палажэнні.

Да асноўных умоў узнікнення канфлікту інтарэсаў адносяцца:

незахаванне органамі кіравання Банка, службовымі асобамі і работнікамі Банка патрабаванняў заканадаўства, лакальных прававых актаў, у тым ліку па

размежаванні паўнамоцтваў, а таксама парушэнне нормаў дзелавых зносін і прынцыпаў прафесійнай этыкі;

неэфектыўная арганізацыйная структура Банка;

незахаванне прынцыпу прыярытэту інтарэсаў Банка і яго кліентаў (кантрагентаў) перад асабістымі інтарэсамі, злоўжыванне службовым становішчам у асабістых мэтах;

іншыя ўмовы, указаныя ў Палажэнні.

Да асноўных мер па выключэнні канфлікту інтарэсаў у Банку і Холдынгу адносяцца:

строгае выкананне органамі кіравання Банка, службовымі асобамі і работнікамі Банка працэдур ажыццяўлення банкаўскіх аперацый і іншай дзейнасці, устаноўленых заканадаўствам, Статутам Банка і лакальнымі прававымі актамі Банка, а таксама строгае выкананне органамі кіравання арганізацый, якія ўваходзяць у склад Холдынгу, іх службовымі асобамі і работнікамі працэдур здзяйснення здзелак, устаноўленых заканадаўствам, іх статутамі і лакальнымі прававымі актамі;

дакладнае размеркаванне паўнамоцтваў у працэсе кіравання і прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў па банкаўскай дзейнасці паміж Агульным сходам акцыянераў Банка, Саветам Дырэктараў Банка, Праўленнем Банка, Старшынёй Праўлення Банка, калегіяльнымі органамі і асобнымі службовымі асобамі Банка;

ажыццяўленне на ўсіх узроўнях кіравання бягучага маніторынгу дзеянняў і рашэнняў, якія могуць прывесці да ўзнікнення канфлікту інтарэсаў;

іншыя меры, указаныя ў Палажэнні.

Выяўленне канфлікту інтарэсаў ажыццяўляецца на пастаяннай аснове ўсімі работнікамі Банка і арганізацый, якія ўваходзяць у склад Холдынгу, у ходзе сваёй бягучай дзейнасці. Для ўрэгулявання канфлікту інтарэсаў, які ўзнікае ў дзейнасці Банка і Холдынгу, органы кіравання і іх члены, службовыя асобы і работнікі Банка і арганізацый, якія ўваходзяць у склад Холдынгу, абавязаны ажыццяўляць дастатковыя меры з мэтай пошуку такога рашэння, якое, з'яўляючыся законным і абгрунтаваным, забяспечвала б дасягненне балансу інтарэсаў Банка і Холдынгу.

Патрабаванні Палажэння падлягаюць абавязковаму выкананню органамі кіравання і іх членамі, службовымі асобамі і работнікамі Банка, кіраўнікамі і работнікамі арганізацый, якія ўваходзяць у склад Холдынгу, якія нясуць адказнасць за невыкананне патрабаванняў Палажэння ў адпаведнасці з заканадаўствам і лакальнымі прававымі актамі Банка.

Усе работнікі Банка і арганізацый, якія ўваходзяць у склад Холдынгу, нясуць адказнасць за прыняцце празрыстых і ўзважаных рашэнняў, свабодных ад дзеяння канфлікту інтарэсаў.